УДК 385.81

**Гатальскі Сяргей Сяргеевіч,**
курсант 1 курса
Навуковы кіраўнік Савік С. А.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ЦЯЖКІ ЛЕС МАІХ СВАЯКОЎ

**Анатацыя.** Гісторыі жыцця маіх сваякоў якія прайшлі скрозь жахі вайны. Ніхто з іх не выбіраў такі лес, але ў адказны момант яны змаглі праявіць рашучасць і адвагу.

Звычайны падлетак Мікалай Іосіфавіч Гатальскі быў гатовы ахвяраваць сабой каб выратаваць жыцці двух людзей, а калі яму споўнілася 17 гадоў ен па ўласнай волі пайшоў на фронт, дзе дапамагаў вызваляць сваю Радзіму.

Гэтак жа як і звычайная настаўніца Кузьмянкова Юлія Васільеўна і яе брат Кузьмянкоў Адам Васільевіч, якія кожны дзень рызыкавалі жыццем, але ўсе роўна падтрымлівалі працу Гомельскага падполля.

Ну і нарэшце мой прадзед Сарокін Аляксей Іванавіч чалавек што прайшоў скрозь жахі канцлагера. Але нават пасля таго як ен збег з канцлагера не ўсміхнулася яму, яго злавілі фашысты далі рыдлеўку і сказалі сабе капаць магілу, аднак нават з такой бязвыхаднай сітуацыі ен змог выбрацца.

**Ключавыя словы:** прадзед, прабабуля, фронт, акупацыя, партызанскі рух, падполле.

**Увядзенне.** Прайшло ўжо больш за 80 гадоў з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Жывых сведак тых падзей застаецца ўсе менш, а захаваць гістарычную памяць становіцца ўсе складаней. Але праўда павінна жыць. А для гэтага неабходна прыкладваць намаганні. І з кожным годам такіх намаганняў павінна быць больш.

Здавалася б, якое стаўленнем я, у свае 17 гадоў, маю да падзей васьмідзесяцігадовай даўніны? Але гэта толькі на першы погляд. Насамрэч, тыя падзеі ўспрымаюцца мною як асабістая трагедыя, таму што ў маей сям'і, як і ў іншых беларускіх сем'ях, есць блізкія, якім давялося пабываць у самым пекле вайны. Памяць аб гэтых людзях жывая і перадаецца з пакалення ў пакаленне. У нас дома, сярод дакументаў, захоўваецца маленькая скрыначка, у якой беражліва сабраны пажоўклыя ад часу фотаздымкі і газетная выразка тых гадоў. Гэтую скрыначку перадала мая прабабуля маей бабулі, а мая бабуля – маей маме. Гэтая скрыначка з'яўляецца сімвалам нашай сям'і. Мне вельмі падабалася разглядаць яе змесціва і слухаць апавяданні бабулі, дзядулі ці мамы пра тое, як блізкія мне людзі абаранялі сваю сям'ю, свой дом, сваю Радзіму. У такія моманты я адчуваў гонар, што з'яўляюся іх нашчадкам,

і ўпэўненасць у тым, што на іх месцы я паступіў бы таксама. Гэтую маленькую скрыначку, з вялікай гісторыяй, я абавязкова захаваю для сваіх дзяцей.

**Асноўная частка.** У Веткаўскім раене, размешчана веска Жалезнікі. У ей жыў са сваей сям'ей мой прапрадзед Язэп. Ен працаваў у калгасе, вырошчваў хлеб. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ен быў прызваны ў армію. Беларусы разам з іншымі народамі абаранялі ўсю краіну. Мой прапрадзед абараняў блакадны Ленінград. Звестак аб яго службе не захавалася. Сціплыя людзі не лічылі сябе героямі і шмат пра сябе не распавядалі. Пасля зняцця блакады прапрадзед быў дэмабілізаваны, вярнуўся дадому, дзе памер праз некалькі месяцаў.

Старэйшы сын у яго сям'і – *Мікалай Іосіфавіч Гатальскі*. Мой прадзед. Ен быў падлеткам, калі ў веску прыйшлі акупанты. Суседзі распавядалі, што аднойчы, у размове з маладымі нямецкімі салдатамі, Мікалай, выкарыстоўваючы невялікія школьныя веды нямецкай мовы, казаў: "Сталін гут ман! Сталін-грос ман!"Калі фашысты выхваляліся колькасцю германскіх самалетаў і танкаў, Мікалай назваў большую колькасць савецкіх танкаў і самалетаў. Немцы раззлаваліся і павялі яго ў камендатуру для разбору. Пра гэта даведалася цетка Мікалая і пабегла следам. Там яна жэстамі спрабавала пераканаць каменданта ў тым, што гэты падлетак дурны, хворы. На што камендант паказаў на палку, якая стаяла каля плота, і даў зразумець, што яго неабходна высячы. Але адпусціў і Мікалая, і яго цетку.

Быў выпадак, калі ў хату зайшлі немцы і запатрабавалі накарміць іх. Пакуль маці збірала на стол, Мікалай непрыкметна выйшаў. На фурманцы, якую немцы прывязалі побач з домам, сядзела два чалавекі. Гэта былі яўрэі. Куды і з якой мэтай іх везлі-застаецца толькі здагадвацца. Мікалай адвязаў коней і даў павады ў рукі гэтым людзям, спрабуючы захаваць ім жыцце. Але яны так і засталіся сядзець і нават не распачалі ніякай спробы выратавацца. Неўзабаве выйшаў немец, і Мікалаю вельмі патрапіла за яго ўчынак. Пра лес тых людзей, якіх яны перавозілі, нічога не вядома.

Пасля вызвалення вескі мой прадзед (Мікалай Іосіфавіч Гатальскі) пайшоў на фронт. Яму не было васемнаццаці гадоў. Ен ваяваў куляметчыкам, удзельнічаў у вызваленні Гомеля, быў цяжка паранены. Яго параненага прыцягнуў таварыш з нейтральнай тэрыторыі. Прадзядуля быў узнагароджаны медалем «За адвагу», ордэнам Айчыннай вайны I ступені [1].

Гэта ўсе што мне вядома пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны па лініі майго дзеда. Па лініі бабулі таксама есць пра што расказаць.

Мая прабабуля, *Кузьмянкова Юлія Васільеўна* (1920–2000 гады). У дзевятнаццаць гадоў засталася ўдавой. Гадавала маленькую дачку. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў весцы Новая Зенькавіна. Нялегка ей было. І тут прыйшла вайна.

Яе брат, *Кузьмянкоў Адам Васільевіч* (1913–2008 гады), займаўся арганізацыяй падпольнай працы і партызанскага руху на Кармяншчыне [2]. З 1941 па 1945 гады быў намеснікам камандзіра, а затым камісарам атрада імя Варашылава 1-й Гомельскай партызанскай брыгады [3]. Ен і яшчэ некалькі

мужчын хаваліся ў сястры ў хляве. Там была выкапана яма, у якой яны знаходзіліся. Яму прыкрылі дошкамі, а зверху саломай, для маскіроўкі. Сястра дапамагала яму, як магла, часта даводзілася рызыкаваць жыццем. Яна была сувязной падполля. Перадавала данясення, распаўсюджвала агітацыйныя улеткі, збірала звесткі. У нее тры разы быўператрус. Немцы спрабавалі знайсці людзей, якіх хавала Юлія Васільеўна. Праз шмат гадоў яна не пераставала здзіўляцца таму, што немцам так і не ўдалося іх выявіць.

У 1942 годзе Адам Васільевіч атрымаў раненне ў галаву, з-за чаго страціў зрок левага вока. У 1943 годзе, незадоўга да вызвалення, у весцы Задуб'е фашысты расстралялі бацьку Юліі Васільеўны, Кузьмянкова Васіля Ціханавіча, майго прапрадзедушку. Падчас Першай сусветнай вайны ен страціў ногу. Калі фашысты зганялі жыхароў вескі, прапрадзед не паспяваў за ўсімі, стаў адставаць. Тады фашысты застрэлілі яго. Атрымала раненне і маці прабабулі, ад чаго і памерла.

Яшчэ прабабуля распавядала маей маме пра выпадак, які адбыўся з ей. Калі ішла на рэчку паласкаць бялізну, за ей на нізкай вышыні ляцеў на самалеце немец і страляў. Прабабуля бегла з дзіцем на руках, але нават гэта яго не спыняла. Ей удалося схавацца ў полі, такім чынам яна выратавала жыцце сабе і дачцэ. Прабабуля была ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалем «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені [4]. Яе брат быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1 ступені, медалямі «партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені, «за доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 г.г.», «за перамогу над Германіяй» [2].

Мой прадзед, *Сарокін Аляксей Іванавіч*, удзельнік фінскай вайны. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ен пабываў у канцлагеры ў Бабруйску. З яго прадзеду і яго брату Івану ўдалося збегчы. Ен вярнуўся дадому ў Гомель і зноў пайшоў на фронт. Быў схоплены фашыстамі. Фашысты далі прадзеду ў рукі рыдлеўку і загадалі капаць яму для ўласнай магілы. Ім падабалася гуляць чужым жыццем. Толькі падзеі не сталі развівацца па плане фашыстаў. Нават у такой, здавалася б, бязвыхаднай сітуацыі, мой дзед не паў духам. Знайшоўшы момант, калі адзін з фашыстаў адлучыўся па натуральных патрэбах, ен забіў другога лапатай і збег. Мой прадзед, Сарокін Аляксей Іванавіч, прымаў удзел у баявых дзеяннях да самага канца вайны. Дайшоў да Берліна, адкуль вярнуўся з перамогай. На жаль, ен памер вельмі рана, калі маей бабулі было 9 гадоў. Таму пачуць аповяд з яго вуснаў змагла толькі бабуля. У сілу свайго ўзросту яна не запомніла дакладных дат і ўсіх падзей.

**Заключэнне.** Мае блізкія людзі, пра якія я распавеў, як і дзясяткі, сотні tsсяч іншых людзей, сваімі гераічнымі ўчынкамі, цаною ўласнага жыцця, змаглі адстаяць наша права жыць пад мірным небам.

А мы? Мы павінны прыкласці максімум намаганняў, каб захаваць памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Николай Иосифович Готальский: Память народа [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/heroes/person-hero80808937. – Дата доступа: 17.11.2025.

2. Кузьмянков Адам Васильевич: Память народа [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/heroes/person-hero40458115. – Дата доступа: 17.11.2025.

3. Партизаны Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://partizany.by/partisans/28018/. – Дата доступа: 17.11.2025.

4. Кузьмянкова Юлия Васильевна: Память народа [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://pamyat-naroda.ru/heroes/podvig-chelovek_yubileinaya_kartoteka1524756531. – Дата доступа: 17.11.2025.